СУСТРЭЧЫ

# ТВОРЧАСЦЬ – ВАЙСКОЎЦАМ

**ЛІДСКІ РАЁН. Літаратары Лідчыны правялі чарговыя творчыя сустрэчы з вайскоўцамі-пагранічнікамі.**

11 красавіка члены Лідскага раённага літаратурнага аб’яднання «Суквецце», якое дзейнічае пры «Лідскай газеце», адгукнуліся на запрашэнне кіраўніцтва Лідскага пагранічнага атрада і правялі творчыя сустрэчы на пагранічных заставах Сурвілішкі, Суботнікі і Геранёны.

Удзельнікі літаратурнага тура, паэтэсы Ірына Маркевіч, Ала Юшко і Людміла Русь падзяліліся з вайскоўцамі сваёй творчасцю, прачыталі аўтарскія вершы, адказалі на пытанні. Тэматыку мерапрыемстваў і агучаных твораў можна ахарактарызаваць, як грамадзянска-патрыятычную, філасофскую, рамантычную. З вуснаў гасцей ваеннаслужачая моладзь пачула паэзію пра любоў да Радзімы, прыгажосць нашай прыроды, пра сяброўства і зразумела, пра каханне.

Асноўнымі матывамі выступленняў літаратараў раёна перад воінамі-пагранічнікамі сталі 80-годдзе Перамогі, гераізм савецкага народа-пераможца фашызму, вечная народная памяць аб трагічных старонках гісторыі, недапушчальнасць паўтарэння жахаў вайны. Кантакты з аўдыторыяй усталяваліся шчырыя і добразычлівыя. Вынікам сустрэч для ўсіх іх удзельнікаў (гаспадароў і гасцей) стаў зарад натхнення на далейшую працу.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** падчас творчых сустрэч членаў Лідскага раённага літаратурнага аб’яднання «Суквецце», паэтэс Ірыны Маркевіч, Алы Юшко і Людмілы Русь з ваеннаслужачымі пагранічных застаў Лідскага раёна. 11 красавіка 2025 года.





Выступае аматар літаратуры, паэтэса Ірына Маркевіч




Выступае паэтэса-аматар Ала Юшко



Выступае аматар літаратуры, паэтэса Людміла Русь




ИХ ИМЕНАМИ НАЗВАНЫ
ЗАСТАВЫ